Праваабарончы
Веснік
ліпень 2012
Магілёўскі праваабарончы інфармацыйны бюлетэнь

ПРАВААБАРОНЦА АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ БОЛЬШ ГОДУ ЗА КРАТАМІ

Кіраўнік Праваабарончага цэнтру «Вясна» быў арыштаваны 4 жніўня 2011 г.

Алесь Бяляцкі застаецца пад арыштам з 4 жніўня 2011 г. Ён



Алесь Бяляцкі падчас суду

быў абвінавачаны ўва ўтойванні прыбыткаў у асабліва буйным памеры. Фармальнай падставай для крымінальнага пераследу праваабаронцы стала інфармацыя пра ягоныя рахункі ў замежных банках. На гэтых рахунках збіраліся сродкі для дапамогі рэпрэсаваным беларускім грамадзянам. Інфармацыя пра рахункі была перададзеная ўладам Беларусі Міністэрствам юстыцыі Літвы ды Генпракуратураю Польшчы. Пазней улады гэтых краінаў афіцыйна адклікалі перададзеную інфармацыю, публічна папрасілі прабачэння ў Бяляцкага і ягоных сваякоў, а таксама прыпынілі кантакты з Беларуссю ў межах дамоваў аб прававой дапамозе.

Тым не меньш, 24 лістапада 2011 г. Алесь Бяляцкі быў асуджаны Першамайскім судом Менска на 4,5 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Зараз ён адбывае пакаранне ў бабруйскай калоніі №2.

Вызвалення Бяляцкага патрабуюць беларускія і міжнародныя праваабарончыя структуры, кіраўніцтва Еўрасаюза, ЗША і шэрагу іншых дэмакратычных краінаў.

Ён прызнаны вязнем сумлення беларускімі і міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі.

Алесь Бяляцкі вылучаны на атрыманне Нобелеўскай прэміі міру шэрагам урадаў, парламентарыяў, грамадскімі арганізацыямі і лаўрэатамі Нобелеўскай прэміі міру мінулых гадоў.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» - неўрадавая праваабарончая арганізацыя, створаная ў красавіку 1996 году падчас масавых акцыяў пратэсту дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі, якая пасля арыштаў удзельнікаў дэманстрацыяў займалася дапамогай арыштаваным і іх сем'ям. Таму першапачаткова арганізацыя мела назву «Вясна-96». 15.06.1999 г. арганізацыя была зарэгістраваная як Грамадскае аб'яднанне «Праваабарончы цэнтр «Вясна». Уяўляе сабой рэспубліканскае аб'яднанне з цэнтрам у г.Мінску і рэгіянальнымі арганізацыямі ў большасці буйных гарадоў Беларусі. Па ўсёй краіне колькасць сябраў складае каля 200 чалавек. Асноўныя паўнамоцтвы па кіраванні арганізацыяй належаць Радзе і Старшыні Рады, якія абіраюцца на Агульным сходзе.

Рашэннем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь 28.10.2003 г. за ўдзел у назіранні падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 г. Праваабарончы цэнтр «Вясна» быў беспадстаўна пазбаўлены дзяржаўнай рэгістрацыі. Сябры арганізацыі неаднаразова спрабавалі дамагчыся легальнага статусу арганізацыі, але беларускія ўлады па надуманых прычынах адмаўлялі ім у гэтым. 06.03.2004 г. ПЦ «Вясна» быў прыняты ў Міжнародную Федэрацыю Правоў Чалавека (FIDH).

Праваабарончы цэнтр «Вясна» займаецца аказаннем юрыдычнай, матэрыяльнай ды іншай дапамогі рэпрэсаваным і іх сем'ям, маніторынгам сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, назіраннем за выбарчымі кампаніямі, асветніцкай дзейнасцю ў галіне правоў чалавека.

БЕЛАРУСКІЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Праваабарончы цэнтр "Вясна" прызнае наяўнасць у Беларусі палітычных вязняў - асобаў, якія незаконна пазбаўлены свабоды за свае палітычныя перакананні, і патрабуе іх неадкладнага вызвалення.

1. МІКАЛАЙ АЎТУХОВІЧ.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.

Узяты пад варту 8 лютага 2009 г., асуджаны 6 траўня 2010 г. Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь па ч. 3 арт. 295 Крымінальнага кодэксу (незаконныя дзеянні ў адносінах да вогнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў) да 5 гадоў і 2 месяцаў пазбаўленьня волі ва ўмовах строгага рэжыму. Рашэннем суду ад 17 студзеня 2012 г. умовы адбыцця пакарання былі змененыя на больш жорсткія, пераведзены з калоніі №5 у Івацэвічах ў турму №1 г.Гродна.

2. МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ.
Знаходзіцца ў турме за тое, што быў супернікам А.Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах 2010 году.

Узяты пад варту 20 снежня 2010 г., асуджаны 26 траўня 2011 г. судом Партызанскага раёна г.Менску па ч. 1 арт. 293 КК (арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаліся гвалтам над асобай, пагромамі, падпаламі, знішчэннем маёмасці і узброеным супраціўам прадстаўнікам улады) да 6 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Рашэннем суду ад 12 студзеня 2012 г. умовы адбыцця пакарання былі змененыя на больш жорсткія, пераведзены з калоніі №17 у Шклове ў турму №4 г. Магілёва.

3. ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ.
Знаходзіцца ў турме за тое, што з'яўляецца палітычным актывістам.
Узяты пад варту з 20 снежня 2010 г., асуджаны 16 траўня 2011 г. судом Заводскага раёна г.Менску па ч.1 арт. 342 КК (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо ўдзел у іх) да 3 гадоў абмежавання волі. Знаходзіцца ў ПУАТ-7 в.Куплін.

4. ЗМІЦЕР ДАШКЕВІЧ.
Знаходзіцца ў турме за тое, што з'яўляецца лідарам Маладога Фронту.
Узяты пад варту з 18 снежня 2010 г., асуджаны 24 сакавіка 2011 г. судом Маскоўскага раёна г.Менску па ч. 2 арт. 339 КК (злоснае хуліганства) да 2 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму. Знаходзіцца ў калоніі №13 у Глыбокім.

5. ЭДУАРД ЛОБАЎ.
Знаходзіцца ў турме за тое, што з'яўляецца актывістам Маладога Фронту.
Узяты пад варту з 18 снежня 2010 г., асуджаны 24 сакавіка 2011 г. судом Маскоўскага раёна г.Менску па ч. 3 арт. 339 КК (асабліва злоснае хуліганства) да 4 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах строгага рэжыму. Знаходзіцца ў калоніі №22 у Івацэвічах.

6. СЯРГЕЙ КАВАЛЕНКА.
Знаходзіцца ў турме за тое, што вывесіў бел-чырвона-белы сцяг.
Узяты пад варту 22 снежня 2011 г. па новай крымінальнай справе па арт.415 КК (парушэнне ўмоў адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі). Яшчэ 14 траўня 2010 г. ён быў асуджаны па ч.1 арт. 339 КК (наўмысныя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак) Кастрычніцкім судом г.Віцебска да 3 гадоў абмежавання волі без накіравання. Прысуджаны да 2 гадоў і 1 месяца пазбаўлення волі ў калёніі агульнага рэжыму, адбывае пакаранне ў магілёўскай калёніі №19.

7. АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ.
Знаходзіцца ў турме за тое, што займаўся праваабарончай дзейнасцю.
Узяты пад варту з 4 жніўня 2011 г., асуджаны 24 лістапада 2011 г. судом Першамайскага раёна г.Менску па ч.2 арт. 243 КК (утойванне прыбыткаў у асабліва буйным памеры) да 4,5 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Адбывае пакаранне ў калёніі №2 г.Бабруйску.

8. МІКАЛАЙ ДЗЯДОК.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.
Узяты пад варту з 3 верасня 2010 г., асуджаны 27 траўня 2011 г. судом Заводскага раёна г.Менску па ч.2 арт. 339 КК (злоснае хуліганства) да 4,5 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Знаходзіцца ў калоніі №17 у Шклове.

9. ІГАР АЛІНЕВІЧ.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.

Узяты пад варту з 29 лістапада 2010 г., асуджаны 27 траўня 2011 г. судом Заводскага раёна г.Менску па ч.2 арт. 339 КК (злоснае хуліганства), ч.2 і ч.3 арт.218 КК (пашкоджанне маёмасці агульнанебяспечным спосабам і ў асабліва буйным памеры) да 8 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Знаходзіцца ў калоніі №10 у Наваполацку.

10. АЛЯКСАНДР ФРАНЦКЕВІЧ.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.
Узяты пад варту з 3 верасня 2010 г., асуджаны 27 траўня 2011 г. судом Заводскага раёна г.Менску па ч.2 арт. 351 КК (наўмыснае знішчэнне кампутарнай інфармацыі) і ч.2 арт.339 КК (злоснае хуліганства) да 3 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Знаходзіцца ў калоніі №22 у Івацэвічах.

11. ВАСІЛЬ ПАРФЯНКОЎ.
Знаходзіцца ў турме за тое, што з'яўляецца палітычным актывістам.
Асуджаны да адбыцця пакарання ў выглядзе 6 месяцаў арышту 9 жніўня 2012 г. паводле прысуду суда Першамайскага раёну г.Менску ад 29 траўня 2012 г. па артыкуле 421 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь («парушэнні ўмоваў прафілактычнага нагляду»). Адбывае пакаранне ў СІЗА г.Баранавічы.

12. * ЯЎГЕН ВАСЬКОВІЧ.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.
Узяты пад варту з 17 студзеня 2011 г., асуджаны 18 траўня 2011 г. судом Бабруйскага раёна і г.Бабруйску ч.2 арт.339 КК (злоснае хуліганства) і ч.3 арт.218 КК (пашкоджанне маёмасці ў асабліва буйным памеры) да 7 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Рашэннем суду ад 12 кастрычіка 2011 г. умовы адбыцця пакарання былі змененыя на больш жорсткія, пераведзены з калоніі №15 у Магілёве ў турму №4 г. Магілёва.

13. * АРЦЁМ ПРАКАПЕНКА.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.
Узяты пад варту з 17 студзеня 2011 г., асуджаны 18 траўня 2011 г. судом Бабруйскага раёна і г.Бабруйску ч.2 арт.339 КК (злоснае хуліганства) і ч.3 арт.218 КК (пашкоджанне маёмасці ў асабліва буйным памеры) да 7 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Знаходзіцца ў турме №15 у Магілёве.

14. * ПАВАЛ СЫРАМОЛАТАЎ.
Знаходзіцца ў турме за свае палітычныя перакананні.
Узяты пад варту з 17 студзеня 2011 г., асуджаны 18 траўня 2011 г. судом Бабруйскага раёна і г.Бабруйску ч.2 арт.339 КК (злоснае хуліганства) і ч.3 арт.218 КК (пашкоджанне маёмасці ў асабліва буйным памеры) да 7 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Знаходзіцца ў калоніі №19 у Магілёве.

***У дзеяннях дадзеных асобаў угледаюцца прыкметы правапарушэння, але адзначаем несправядлівую кваліфікацыю іх дзеянняў і празмернасць вынесенага пакарання. Лічым, што яны адбылі ўжо дастатковае пазбаўленне волі для здзейсненага ўчынку і ўтрыманне надалей іх у зняволенні палітычна матываванае.**

СПРАВКА

Кто такие политзаключённые?

Авторитетная международная организация «Международная амнистия» политзаключённым называет человека, в лишении свободы которого присутствует существенный политический момент.

Политзаключенных зачастую осуждают по итогам процессов, сопровождавшихся нарушениями международных норм справедливого судопроизводства. Иногда их годами держат в предварительном заключении без суда и следствия. Amnesty International требует, чтобы все политические заключенные предстали перед справедливым судом в разумные сроки.

В отличие от узников совести, среди политзаключённых могут быть и те, кто прибегал к насильственным действиям (в том числе совершая уголовно-наказуемые деяния), либо призывал к насилию или вражде. Однако все обвинения в их адрес либо их часть могут быть и ложными. Amnesty International добивается лишь того, чтобы дела таких людей были рассмотрены в суде в разумные сроки и с соблюдением всех гарантий справедливого суда, как-то: право на адвоката по своему выбору, отказ от рассмотрения показаний, полученных под пытками и так далее.

Термин «политзаключенный» не означает, что человек обладает каким-то особым статусом, или что организация придаёт ему какое-то особое значение. Amnesty International не поддерживает и не опровергает взгляды таких людей, а также никак не оценивает необходимость тех или иных боевых действий в ходе политического противостояния или конфликта.

БЕЛОРУССКИМ ПОЛИТЗАКЛЮЧЕННЫМ ВАЖНА ВАША ПОДДЕРЖКА

Людям, которые лишены свободы за свои убеждения, особенно важна поддержка общества. Найдите несколько минут и напишите политическим заключенным! Возможно, именно ваши слова помогут им выдержать испытание неволей.

Вы можете написать политзаключенным письмо, подписать открытку, послать телеграмму (они принимаются также и по телефону, номер службы - 166).

Алесь Беляцкий:
213807, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Сикорского, 1, ИК №2, отряд 14

Николай Статкевич, Евгений Васькович:
212011, г. Могилев, ул. Крупской, 99а, тюрьма №4

Николай Дедок: 213004, Могилевская обл., г. Шклов, ИК №17

Артем Прокопенко: 213105 г. Могилев, Славгородское шоссе, 183, ИК №15

Павел Сыромолотов, Сергей Коваленко:
213030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 3-й км, ИК №19

Николай Автухович: 230023, г. Гродно, ул. Кирова, 1, тюрьма №1

Дмитрий Дашкевич:
211791, Витебская область, г. Глубокое, ул. Советская, 205, ИК №13

Эдуард Лобов, Александр Францкевич:
225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, «Волчьи норы», а/я 20, ИК №22

Игорь Олиневич: 211440, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Техническая, 8, ИК №10

Василий Парфенков:
225413, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, 258, СИЗО №6

Павел Северинец: 225143, Брестская обл., Пружанский р-н, д.Куплин, ПУАТ-7

Старонка Магілёўскага аддзялення Праваабарончага цэнтру «Вясна» ў інтэрнэце:

www.mahilyowspring.org

Праваабарончы веснік. Магілёўскі праваабарончы інфармацыйны бюлетэнь. Распаўсюджваецца бясплатна. Наклад: 299 ас.